# З ЮБІЛЕЕМ, ГрДУ!




# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● *№ 4 (255)* ● *1 чэрвеня 1998 года, панядзелак*
Выходзіць адзін раз у месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 20 ГАДОЎ

**Адной са старэйшых вну Рэспублікі Беларусь і першай вну Заходняй Беларусі - Гродзенскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Янкі Купалы спаўняецца праз два гады шэсцьдзесят гадоў, а сёння мы святкуем 20-гадовы юбілей пераўтварэння Гродзенскага педінстытута у Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.**

**Немагчыма пераацаніць ролю нашай навучальнай установы для рэгіёна і ў цэлым для рэспублікі. Выпускнікі ГрДУ вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Як гэта было? У 1940 годзе ў памяшканні былой жаночай гімназіі створаны настаўніцкі інстытут. Узноўлены ў 1944 годзе пасля вызвалення Беларусі са статусам педінстытута, ён адыграў важную ролю ў станаўленні культурнага і інтэлектуальнага асяроддзя Заходняй Беларусі. Практычна ўсе педагагічныя кадры рыхтаваліся менавіта тут.**

**У сценах інстытута атрымалі пуцёўку ў жыццё такія знакамітыя людзі Рэспублікі Беларусь як вядомыя ва ўсім свеце акадэмік Л.Н.Ціханаў, прафесар Ф.М.Янкоўскі, прафесар В.М.Міхнюк, пісьменнікі Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава, Пятрусь Макаль, заслужаны настаўнік краіны Алесь Белакоз.**

**Праславілі Беларусь далёка за яе межамі выпускнікі Гродзенскага педінстытута легендарныя спартсмены Алена Валчэцкая, Вольга Корбут, Аляксандр Курловіч, Аляксандр Федарэнка і іншыя.**

**Сёння ГрДУ - буйнейшы навукова-адукацыйны цэнтр рэгіёна, міжнародна прызнаны універсітэт класічнага тыпу. Ён адыгрывае адну з вызначальных роляў у навуковым і грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Перспектывы развіцця нацыянальнай сістэмы вышэйшай адукацыі непарыўна звязаны з фундаментальнымі ведамі і натхнёнай працай навукоўцаў.**



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ.** *СВАІМІ ЎСПАМІНАМІ ДЗЕЛЯЦЦА ВЕТЭРАНЫ-ВЫКЛАДЧЫКІ ГрДУ.* Стар. 2-6.

**ЯКІМІ МЫ БЫЛІ?** *ЗАЗІРНЕМ У "СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ".* Стар. 2-6.

**МАЛАДАЯ ЗМЕНА РАСЦЕ ДАСТОЙНАЯ.** Стар. 7.

**ШТО ДЛЯ ВАС ЗНАЧЫЦЬ УНІВЕРСІТЭТ?** Стар. 7-8.

**ЦИТАТА НОМЕРА:**

***"Мера жизни не в ее длительности, а в том, как вы ее использовали".***

***М.Монтень.***

## СУСТРЭЧА З ПРЭЗІДЭНТАМ

5 мая ў канцэртнай зале "Мінск" у сталіцы нашай Рэспублікі адкрываўся форум журналістаў краін СНД, прысвечаны дню друку, у якім прыняў удзел прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка. У ліку дэлегацыі Гродзенскай вобласці на форуме пабывала і рэдактар універсітэцкай шматтыражнай газеты "Гродзенскі універсітэт".

Форум адкрыў старшыня Саюза журналістаў Беларусі Леанід Екель, і адразу ж пасля адкрыцця пасяджэння на сцэну выйшаў Прэзідэнт. Перапоўненая зала, у якой знаходзіліся работнікі друку не толькі нашай краіны, але і сродкаў масавай інфармацыі з Расіі, краінаў Балтыі, а таксама Азербайджана, Казахстана, Кіргізіі, сустрэлі кіраўніка нашай дзяржавы бурнымі апладысментамі.

У выступленні Прэзідэнта адчувалася трывога за тое, якімі будуць прыярытэты ў трэцім тысячагоддзі. Слова - вялікая сіла, якая аб'ядноўвае людзей, - сказаў А.Р.-Лукашэнка. -Але ж яно можа і размяжоўваць і людзей, і цэлыя народы. Таму і паўстае праблема адказнасці журналістаў за сказанае і напісанае слова.

Прэзідэнт падрабязна спыніўся на праблемах і задачах друку і электронных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама расказаў аб эканамічным палажэнні Рэспублікі, шляхах выхаду з крызіснага становішча, перспектывах развіцця, прыярытэтах дзяржаўнай палітыкі.

Сустрэча з Прэзідэнтам была для журналістаў карыснай і запамінальнай. А.Р.Лукашэнка адказаў таксама на пытанні прысутных, якія можна было задаваць і ў пісьмовым выглядзе, і з месца, ля мікрафонаў, што былі ўстаноўлены ў зале.

На фоне выступленняў удзельнікаў форума запомнілася таксама выступленне выкладчыка факультэта журналістыкі БДУ, прафесара Барыса Стральцова, якога зала сустрэла ў літаральным слове авацыяй.

Адбылося таксама ўручэнне дыпломаў, прэмій за лепшыя журналісцкія работы мінулага года.

**Л.Данілава.**

# УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ



## ЧЕЛОВЕК, КОТОРОГО ПОМНЯТ И ЛЮБЯТ

*Л. ХУТОРСКАЯ,*
*доцент кафедры лазерной физики и спектроскопии, кандидат педагогических наук*

На бывшем физико-математическом факультете Гродненского государственного педагогического института имени Янки Купалы на физическом отделении работали три преподавателя-участника Великой Отечественной войны. В расписании занятий на факультете стояли дисциплины, которые они вели: астрономия - Александр Иванович Крицкий, теоретическая механика - Аркадий Николаевич Хвощинский, электричество - (общая физика) - Леонид Осипович Самойло. Непосредственно несколько лет на одной кафедре я работала с Александром Ивановичем Крицким.

Сейчас, с позиций прожитых лет, когда уже давно его нет в живых, я задаю себе вопрос: почему этого человека я вспоминаю чаще, чем других, с которыми мне довелось работать рядом? Ответить на этот вопрос нелегко, найти единственную причину трудно, так как его влияние на людей, работающих бок о бок с ним, было чрезвычайно разнообразным. Его отличала большая интеллигентность, скромность, даже некоторая застенчивость. Но ведь интеллигентными и скромными были и другие! Пунктуальность, большая аккуратность, даже педантичность, неторопливость и рассудительность были характерны для него. Умение разговорить собеседника - тоже.

Но не это отличало его, на мой взгляд, от других. Не только эти черты привлекали меня в этой яркой личности.

Александр Иванович Крицкий всей душой любил свое главное дело - преподавать студентам астрономию. В мансарде на 5 этаже главного корпуса пединститута (ул. Ожешко, 22) находился оборудованный им вместе со студентами кабинет астрономии, рядом с которым была дверь на крышу здания, где располагалась астрономическая площадка. Здесь Александр Иванович проводил по вечерам со студентами наблюдения за звездным небом из телескопов.

Творческий дух, которым он жил - неоспоримое достояние нашего университета и по сей день, хотя, к сожалению у нас уже нет ни кабинета астрономии, ни планетария. Астрономическая наука существует давно, но Александру Ивановичу Крицкому, Учителю с большой буквы, дано было каждый раз открывать эту науку перед каждой новой студенческой аудиторией, перед каждым будущим учителем физики и астрономии. И никогда не покидало его чувство любви к своему делу, озаряющее не только его жизнь, но и жизнь тех, кто работал с ним когда-то рядом, кто учился у него.

Без того, что он привнес в мою жизнь, работу, отношение к делу, к людям, мне трудно представить и себя.

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

*НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З ЮБІЛЕЕМ.*

* 4 чэрвеня - **Людмілу Іванаўну ЯРУНЦАВУ** - вядучага інжынера сектара замежных сувязяў і акадэмічнага прадпрымальніцтва.

* 10 чэрвеня - **Лілію Уладзіміраўну БЯРЭЙШЫК** - загадчыка навучальнага сектара.

* 10 чэрвеня - **Валянціну Іларыёнаўну КІРЫЛАВУ** - швейцара навучальнага корпуса № 1.

* 11 чэрвеня - **Паўла Аляксандравіча КАВАЛЕЎСКАГА** - старшага выкладчыка кафедры псіхалогіі.

* 17 чэрвеня - **Дануту Станіславаўну ВАСКЕВІЧ** - гардэробшчыцу навучальнага корпуса № 1.

* 20 чэрвеня - **Георгія Аляксеевіча ЯКУБОВІЧА** - старшага выкладчыка кафедры беларускай літаратуры.

* 24 чэрвеня - **Ірыну Мікалаеўну СЦЁПІНУ** - інжынера-праграміста ВЦ.

* 25 чэрвеня - **Ганну Вітольдаўну ПРУСАК** - выкладчыка кафедры нямецкай мовы.

* 25 чэрвеня - **Крысціну Іванаўну ЛАПЦЕВУ** - прыбіральшчыцу інтэрната "Амега".

## *Віншуем!*

**Браніславу Карлаўну ДЗЬЯЧКОВУ** з днем нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, шчасця, поспехаў.

**Савет ветэранаў.**

# УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ

**І. КРЭНЬ,**
**прафесар, дэкан факультэта гісторыі і культуры**

Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы стаіць на парозе практычна двух юбілеяў: асноўнага - шасцідзесяцігадовага і прамежкавага - дваццацігадовага. У пачатку 2000 года спаўняецца 60 гадоў з дня стварэння на тэрыторыі Заходняй Беларусі першай вышэйшай навучальнай установы - настаўніцкага інстытута, пераўтворанага восенню 1944 года ў педагагічны інстытут. А 1 мая 1978 года на яго базе пачаў дзейнічаць дзяржаўны універсітэт. Так што сёлета ў маі універсітэт адзначыў 20-годдзе. На шляху да сваёй сталасці гэта значная падзея ў жыцці маёй роднай "альма матэр" як бы генеральная рэпетыцыя да галоўнай падзеі заключнага года другога тысячагоддзя. Праўда, лакальныя юбілеі адзначаліся ўжо раней. У 1965 годзе святкавалі 25-годдзе з дня нараджэння вну, у 1974 - 30-годдзе педінстытута. Так што пэўны вопыт, як кажуць, ужо прыдбалі.

Аб настаўніцкім інстытуце вядома не так і многа. Верагодна, што афіцыйна ён пачаў функцыянаваць 20 лютага 1940 года, а першыя заняткі ў ім адбыліся 7 сакавіка. Інстытут меў два факультэты - мовы і літаратуры і фізіка-матэматычны. Навучальны працэс здзяйснялі 20 выкладчыкаў. Размяшчаўся інстытут у будынку былой жаночай гімназіі - помніку архітэктуры канца XIX стагоддзя.

У перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі Гродна вучэбна-матэрыяльная база інстытута была парушана, багатая бібліятэка разрабавана, часткова спалена. Многія былыя выкладчыкі і студэнты мужна змагаліся з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах.

Пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рашэннем Савецкага ўрада ў верасні 1944 года, як падкрэслівалася вышэй, настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут. З гэтага моманту пачаліся заняткі на трох факультэтах: фізіка-матэматычным, філалагічным і замежных моў. У 1954 годзе пачаў працаваць гістарычны факультэт, а ў 1955 годзе факультэт замежных моў быў перададзены Мінскаму педагагічнаму інстытуту замежных моў. У 1956 годзе гістарычны і філалагічны факультэты былі аб'яднаны ў адзіны гісторыка-філалагічны факультэт. На ім рыхтаваліся кадры настаўнікаў гісторыі, беларускай і рускай моў і літаратуры. Праз два гады ў інстытуце быў створаны факультэт методыкі пачатковага навучання, а ў 1964 годзе - біёлага-хімічны факультэт. Праўда, у 1970 годзе набор на гэты факультэт быў прыпынены, неўзабаве і сам факультэт ліквідаваны, а замест яго ў 1972 годзе створаны музычна-педагагічны факультэт. У 1967 годзе гістарычны факультэт выдзеліўся з гісторыка-філалагічнага і стаў называцца гісторыка-педагагічным. На ім рыхтаваліся настаўнікі гісторыі, грамадазнаўства і метадысты па



выхаваўчай рабоце. У 1976 годзе на базе фізіка-матэматычнага факультэта ўтварыліся два самастойныя факультэты: матэматычны і фізічны.

З 1969 года пры інстытуце пачало працаваць падрыхтоўчае аддзяленне, а з 20 лістапада таго ж года - аспірантура, у якой рыхтаваліся навукова-педагагічныя кадры па спецыяльнасцях: матэматычны аналіз, дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні, гісторыя СССР, методыка матэматыкі, беларуская мова.

Структура педінстытута ўключала ў сябе завочнае аддзяленне, вучэбна-кансультацыйны пункт, які абслугоўвае студэнтаў-завочнікаў больш за 40 вну краіны, факультэты грамадскіх прафесій і будучых настаўнікаў. На апошнім, працуючым на грамадскіх пачатках, займаліся штогод звыш 500 школьнікаў. На дзённым аддзяленні інстытута спецыялістаў для народнай адукацыі рыхтавалі па дзевяці спецыяльнасцях і на завочным - па шасці.

У 1957 годзе Гродзенскаму дзяржаўнаму педагагічнаму інстытуту за вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і адукацыі было прысвоена імя Янкі Купалы - Народнага паэта Беларусі. На святочнай вечарыне, наладжанай у інстытуце з гэтай нагоды, прысутнічала жонка песняра - Уладзіслава Францаўна Луцэвіч. Удзельнікі інстытуцкага драматычнага гуртка прадставілі спектакль па п'есе Я.Купалы "Паўлінка".

Што тычыцца матэрыяльна-тэхнічнай базы педінстытута, то да 1962 года ён размяшчаўся ў будынку былой жаночай гімназіі па вуліцы Ажэшкі, 22, у якім нарадзіўся настаўніцкі інстытут і меў усяго 14 аўдыторый. А ў 1962 годзе ў строй дзеючых уступіў новы вучэбны корпус у якасці прыбудовы да старога будынку. Увесь ансамбль і склаў галоўны вучэбны корпус. У ім меліся актавая зала на 700 месцаў, дзве спартыўныя залы, бібліятэка з трыма кнігасховішчамі, асобныя чытальныя залы для студэнтаў і выкладчыкаў, сталоўка на 152 пасадачных месцы, спецыяльна абсталяваныя фізічныя лабараторыі, вучэбныя кабінеты, светлыя аўдыторыі. Меліся яшчэ два



невялікія вучэбныя корпусы, у якіх размяшчаліся студэнты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання і падрыхтоўчага аддзялення, а таксама тры інтэрнаты на 1544 чалавекі.

За 1944-1974 гады ў сценах інстытута было падрыхтавана 9848 спецыялістаў, большасць з якіх былі выхадцамі з сямей калгаснікаў, рабочых і служачых Гродзенскай вобласці.

Да таго часу ў вобласці практычна не было школы, у якой ні працавалі б выпускнікі Гродзенскага педінстытута. І як працавалі! Больш за 750 выпускнікоў сталі дырэктарамі школ, каля 300 былі прыцягнуты да работы ў кіруючых структурах дзяржаўнага, партыйна-камсамольскага і прафсаюзнага апарату, 150 уліліся ў рады навукоўцаў і працавалі ў сістэме Акадэміі навук Беларусі і вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Толькі ў сваім родным інстытуце выкладалі 58 яго выпускнікоў. Выпускнікі інстытута праявілі сябе высокакваліфікаванымі спецыялістамі адукацыі: настаўніца пачатковых класаў Парэчскай СШ Гродзенскага раёна А.І.Маніна стала Героем Сацыялістычнай Працы, каля 220 чалавек мелі высокія ўрадавыя ўзнагароды, 41 выпускнік атрымаў ганаровае званне Заслужанага настаўніка БССР, каля 250 узнагароджаны значком "Выдатнік народнай адукацыі БССР". І гэтую прыемную статыстыку можна працягваць. А да 1978 года прыведзеныя вышэй паказчыкі ўзраслі коль-

*(Працяг на 4-й стар.)*

# УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ

*(Пачатак на 3-й стар.)*

касна і палепшыліся якасна.

Калі задацца пытаннем, што паслужыла асновай, падмуркам для стварэння на базе Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута універсітэта і як гэта адбылося, то я б хацеў без ваганняў сказаць, што такая аснова была і была яна аб'ектыўная. Гродзенскі педінстытут заўсёды лічыўся адным з вядучых сярод правінцыяльных, скажам так, вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Ён вылучаўся і матэрыяльнай базай, адпавядаючым свайму часу навуковым абсталяваннем, добрай бібліятэкай, высокім кадравым патэнцыялам, пастаноўкай навучальна-выхаваўчай, спартыўнай работы. Зусім невыпадкова інстытут быў узнагароджаны ў 1972 годзе юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрафа ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР. Па-другое, адыгралі сваю ролю эканамічны фактар і палітычны разлік. Гродзенская вобласць упэўнена ішла наперадзе ў развіцці сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, рашэнні сацыяльных праблем, займала вядучае месца ў памежным заходнім рэгіёне Беларусі. У суседняй жа Польшчы існаваў філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку, каталіцкі універсітэт у Любліне. Былая Заходняя Беларусь павінна была мець свой універсітэт. І яна яго атрымала. Па-трэцяе, праявіла настойлівасць кіраўніцтва універсітэта, горада і вобласці. Іх галасы былі пачуты ў Мінску. Вельмі паспрыялі станоўчаму рашэнню пытання Яўген Міхайлавіч Бабосаў, Юрый Пятровіч Смірноў, працаваўшыя ў той час у апараце ЦК КПБ на высокіх пасадах.

Універсітэт стварыўся не на пустым месцы, а на базе аднаго з лепшых педінстытутаў. Ён пачаў функцыянаваць з 1 мая 1978 года, а святочнае адкрыццё універсітэта адбылося толькі 13 кастрычніка, хаця першы універсітэцкі набор студэнтаў быў здзейснены з 1 верасня ўсё таго ж 1978 года. Гэта быў пераломны момант у жыцці самой вну і яе калектыва.

Таму будзе справядлівым назваць прозвішчы тых людзей - выкладчыкаў і супрацоўнікаў, стваральнай працай і розумам якіх закладваўся падмурак сённяшняга універсітэта ў Гродне. У першую чаргу да іх адносяцца выкладчыкі грамадазнаўчых дысцыплін - Г.А. Марціросаў, Д.С.Маркоўскі, А.В.Бадакоў, М.В. Барсегян, М.І.Нікалаеў, З.Г.Грыгор'ева, М.Ц.Перальмутар, У.А.Нядзелька, Н.А. Жасан, М.В.Жарскі, У.Д. Разенфельд, І.А.Жураўлёў, І.І.Акінчыц, С.А.Габрусевіч, А.П.Макараў, Ф.Б.Марголін, У.К.Пісараў; філалагічных дысцыплін - П.І.Кавалеўскі, В.А.Вавілаў, М.С.Вілюга, Т.Ф.Сцяшковіч, Н.С.Конанава, С.У.Кліманскі, А.А.Корзун, В.К.Кавалёў, М.В.Пасяўцова, М.Р.Працэнка, С.А. Грыгор'еў, В.П.Казлоў, М.А.Корчыц, Л.А.Лінёў, Н.І. Лаўрынайціс, М.А.Мельнікаў, В.І.Марозаў, С.Ф.Мусіенка, М.А.Нікіцін, А.М.Пяткевіч, І.Я.Лепешаў; матэматыкі і фізікі -К.А.Акімава, Н.Н.Беспамятных, Я.А.Кастальскі, Я.Х.Касцюковіч, Л.У.Кірылюк, С.С.Ануфрык, К.К.Іскра, Я.І. Рывкінд, М.М.Русін, І.М.Сцяпура, Л.М.Гофмеклер, А.Т.Рагойша, Т.Э.Можджар, А.М.Хвашчынскі, І.П.Мартынаў, Л.М.Ківач, А.С.Сідарчук, Р.М.Маціеўскі, А.М.Каладзінскі, Б.Ф.Савельеў; выкладчыкі гісторыі - В.І.Дзенісюк, І.М.Малюкевіч, Б.М.Фіх, Я.Н.Мараш, В.А.Ваяхін, Ф.У.Налівайка, А.П.Аўчыннікаў, І.Ф.Дзяшко, Н.У.Паўлючэнка, П.М.Кобрынец, І.І.Коўкель, А.Я.Станкевіч, М.А.Ткачоў, Б.С.Клейн, Т.Б.Блінова, У.А.Хілюта, В.Д.Барэйкіна, В.М.Чарапіца; выкладчыкі педагогікі і псіхалогіі, музыкі і фізічнага выхавання -Д.М.Захарэнка, Н.Т.Арлова, Я.І.Сярмяжка, М.І.Неўмывакін, Л.Д.Клімава, В.Т.Шараева, І.А.Карпюк, М.А.Мінайлаў, К.У.Вербава, В.А.Місцюк, У.І.Пінчук, А.І.Смаляков, І.Б.Жаброўскі, А.К.Купцоў, В.А.Максімовіч, У.М.Карчэўскі; супрацоўнікі - Ц.М.Гофмеклер, Ф.І.Пазняк, Р.Ю.Раманчук, Т.А.Фурса, Г.М.Папова, А.М.Шышко, В.С.Станкевіч, Л.Я.Аўдзейчык, А.П.Падгайчанка, В.М.Міцясава, Н.П.Міклашэвіч, В.І.Пілец, М.М.Пяткевіч, Л.Я.Балашова, В.В.Чартко, А.К.Ханеўская, Т.І.Гарніцкая, Т.А.Варанцова, К.З.Варэйка, В.П.Удавічэнка, В.К.Дзячкова, Я.М.Таўрская, Л.І.Ярунцава, Л.Ф.Ясная,



Н.В.Струкава, В.У.Малочка, Герой Савецкага Саюза І.Д.Лебедзеў; кіраўнікі прафсаюзнай, камсамольскай і іншых грамадскіх інстытуцкіх арганізацый - П.В.Васільеў, В.Л.Колб, В.І.Хоцім, С.М.Андрыеўскі, Н.К.Пушнянкова, І.Б.Карэйва, У.М.Міхнюк, А.А.Падгайчанка, В.П.Мікалайчык, А.У.Меляшэвіч і іншыя.

За дваццаць год свайго існавання універсітэт прайшоў слаўны шлях у самым лепшым сэнсе гэтых слоў. Прагвала ўдасканальвацца яго структура. Пры гістарычным факультэце было створана аддзяленне правазнаўства, на базе якога з 1 верасня 1981 года пачаў працаваць факультэт правазнаўства. А праз тры гады, у 1984, распачаў працу новы факультэт - біялагічны. З 1 верасня 1990 года з фізічнага факультэта выдзелілася яго вытворчае крыло ў самастойны інжынерны факультэт, а замест прыпыніўшага ў 1981 годзе дзейнасць музычна-педагагічнага факультэта з 1985 года зноў пачаў функцыянаваць факультэт педагогікі і методыкі пачатковага навучання. Завяршаючым акордам рэфармавання структуры універсітэта ў 80-я гады стала адкрыццё ў 1990 годзе на базе аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта самастойнага факультэта беларускай філалогіі і культуры, дарэчы, першага ў Беларусі, пры філалагічным факультэце - аддзялення беларуска-польскай і руска-польскай філалогіі, пры гістарычным - пачалася падрыхтоўка гісторыкаў з дадатковай спецыяльнасцю "Замежная мова".

У першай палове 90-х гадоў структурная перабудова ва універсітэце была практычна завершана. Спачатку на базе Гродзенскага фізкультурнага тэхнікума адкрыўся фізкультурны факультэт, пры факультэце правазнаўства было арганізавана аддзяленне міжнародных эканамічных адносін, у 1993 годзе на філалагічным факультэце пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па замежнай мове (англійскай, нямецкай, французскай). У першай палове 1994 года адбылося ўзбуйненне і пэўнае перапрафіліраванне факультэтаў: інжынерны і фізічны факультэты аб'ядналіся ў інжынерна-фізічны факультэт, аддзяленні правазнаўства і міжнародных эканамічных адносін - у факультэт права і эканомікі, а з філалагічнага факультэта ў самастойны факультэт выдзелілася падрыхтоўка па замежных мовах, а факультэт беларускай філалогіі і культуры і застаўшаяся частка філалагічнага факультэта зліліся ў адзіны філалагічны факультэт. Што тычыцца біялагічнага, гістарычнага факультэтаў і факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання, то яны былі пераўтвораны ў факультэты біялогіі і экалогіі, гісторыі і культуры, псіхалогіі і педагогікі з адпаведнай дадатковай падрыхтоўкай эколагаў, культуролагаў, псіхолагаў і сацыяльных педагогаў. У 1997 годзе факультэт права і эканомікі быў рэарганізаваны ў юрыдычны факультэт і факультэт эканомікі і кіравання, а факультэт замежных моў на правах аддзялення ўвайшоў у склад філалагічнага факультэта. У 1994 годзе падрыхтоўчае аддзяленне было ліквідавана, а на яго месцы ўзнікла аддзяленне даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. Толькі два гады працаваў гуманітарны факультэт, за якім былі замацаваны студэнты-платнікі. Ён сябе не апраўдаў і быў у канцы 1996/97 навучальнага года расфарміраваны.

Да традыцыйных аддзелаў кадраў, вучэбнага і навуковага, гаспадарчага дабавіліся вучэбна-метадычны, юрыдычны, планава-эканамічны і выдавецкі аддзелы. Універсітэт мае сваё выдавецтва.

*(Працяг на 5-й стар.)*

# УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ

(Пачатак на 3-4-й стар.)

І апошняе. З 1994 года ўсе кафедры, уключаючы агульнаўніверсітэцкія і міжфакультэцкія, замацаваны за тымі ці іншымі факультэтамі і з'яўляюцца іх базавымі кафедрамі.

Наймалодшы з дзяржаўных універсітэтаў Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт да 1993/94 навучальнага года меў сучасную матэрыяльна-тэхнічную базу, шырокую інфраструктуру падрыхтоўкі спецыялістаў, высокакваліфікаваныя навукова-педагагічныя кадры. Ва ўніверсітэце быў свой вылічальны цэнтр, тэлецэнтр, дзесяць відэазалаў, 16 камп'ютарных класаў, лінгафонныя кабінеты, вытворчыя майстэрні, больш за 50 лабараторый. На 10 факультэтах і 33 спецыялізацыях займаліся каля 7 тысяч студэнтаў, з іх 4000 - на дзённай форме навучання. Універсітэт рыхтаваў спецыялістаў для работы ў навучальных установах, навукова-даследчых і вопытнаканструктарскіх арганізацыях, вылічальна-інфармацыйных цэнтрах, у прамысловасці, судзе, пракуратуры, адвакатуры, навуковых рэдакцыях і выдавецтвах, архівах, бібліятэках, камерцыйных структурах. Іх падрыхтоўкай займаліся 460 выкладчыкаў і 40 навуковых супрацоўнікаў, у тым ліку 35 прафесароў, дактароў навук і 250 дацэнтаў, кандыдатаў навук. Па 20 спецыяльнасцях паспяхова вялася падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуру і спашукальніцтва. І таму заканамерна, што з 1978 па 1993 годы супрацоўнікамі ўніверсітэта абаронена 21 доктарская і 128 кандыдацкіх дысертацый, а навукоўцамі ўсіх падраздзяленняў штогод выдавалася не менш за 600 публікацый: манаграфій, зборнікаў матэрыялаў, падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, артыкулаў, тэзісаў, дакладаў навуковых канферэнцый. Толькі з 1988 па 1993 гады праведзена больш за 40 навуковых канферэнцый і сімпозіумаў. За гэты ж час універсітэт удзельнічаў у 16 выставах рознага ўзроўню і атрымаў 12 залатых, сярэбраных і бронзавых медалёў. Універсітэт актыўна супрацоўнічаў і супрацоўнічае зараз з вучэбнымі і навуковымі



цэнтрамі Рэспублікі Беларусь, бліжняга і далёкага замежжа, у першую чаргу ў Расіі, на Украіне, у Польшчы, Чэхіі, Германіі, Швецыі, ЗША і іншых дзяржавах. Да сказанага неабходна дадаць, што цесныя сувязі існавалі з сярэднімі спецыяльнымі, школьнымі і дашкольнымі ўстановамі, органамі асветы вобласці.

У сёлетнім навучальным годзе ў разрэзе спецыяльнасцей універсітэт рыхтуе спецыялістаў па наступных групах: гуманітарныя спецыяльнасці - 4018 чалавек, у тым ліку 1809 па правазнаўству, навуковыя спецыяльнасці - 1556, педагагічныя - 2025, эканамічныя - 459, тэхнічныя - 203 чалавекі.

Першаступенная ўвага надаецца якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Яе забяспечваюць 1207 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Прафесарска-выкладчыцкі састаў 58 кафедр універсітэта складаюць 580 штатных супрацоўнікаў і 110 сумяшчальнікаў, з іх 33 дактары навук і 241 кандыдат навук, 1 акадэмік НАН РБ, 36 прафесароў і 167 дацэнтаў. Павышэнне навукова-педагагічнага патэнцыялу ўніверсітэта прадугледжваецца праз усе існуючыя інстытуты падрыхтоўкі спецыялістаў, уключаючы і падрыхтоўку кадраў вышэйшай адукацыі: у магістратуры займаюцца 18, у аспірантуры - 130, у інстытуце спашукальніцтва - 112, дактарантуры - 5 чалавек.

Універсітэт размяшчаецца ў 8 памяшканнях агульнай плошчай звыш 28 тыс. квадратных метраў, дадаткова арэндуе 2070 квадратных метраў плошчы. Навучальнае і навуковае абсталяванне ацэньваецца сумай у 28,1 мільярда рублёў, у тым ліку 10 камп'ютарных класаў, 350 персанальных камп'ютараў. Бібліятэчны фонд складае 600 тысяч тамоў.

У канцы сакавіка пры ўніверсітэце створаны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Яго рэктарам-прарэктарам універсітэта прызначаны кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Я.А.Роўба.

Што ў перспектыве? Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай і кадравай базы, адкрыццё новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, пашырэнне супрацоўніцтва з навучальнымі і навуковымі ўстановамі ў рэгіёне, Рэспубліцы Беларусь, блізкім і далёкім замежжы, сацыяльная падтрымка выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў і многае іншае. Для рэалізацыі



гэтых мэтаў і задач ужо часткова распрацаваны і распрацоўваюцца дзесяць комплексных праграм, паспяхова здзяйсняецца праграма "Жыллё", якая прадугледжвае забеспячэнне кватэрамі да 8 сямей у год (не лічачы ўжо атрыманых выкладчыкамі і супрацоўнікамі 22 кватэр у 1998 годзе), будаўніцтва інтэрната ў мікрараёне "Дзевятоўка", вучэбных комплексаў па завулку Даватара і вуліцы Горкага (пагранічны атрад), крытых тэнісных кортаў па вуліцы Захарава. У стадыі распрацоўкі знаходзяцца маркетынгавая праграма ўніверсітэта, комплексная праграма выхаваўчай работы са студэнтамі, праграма сацыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў і студэнтаў, праграма ўкаранення інфармацыйных тэхналогій, праграма даследчай падрыхтоўкі спецыялістаў і іншыя. Практычна завершана распрацоўка праграмы гуманітарызацыі і гуманізацыі вышэйшай адукацыі, яна размічана на вну рэспублікі і ўжо пачала праходзіць апрабацыю ў ГрДУ імя Янкі Купалы.

Я ўпэўнены, што наш універсітэт мае добрую перспектыву. Упэўненасць гэта выходзіць ад людзей, працаваўшых і працуючых ва ўніверсітэце, пачынаючы ад рэктара і да тэхнічнага работніка, і вядома ж, ад студэнтаў, якія ў ім вучыліся і вучацца зараз. Усе мы разам - адна сям'я, калектыў. Я ў гэтым перакананы, бо ўсё, што робіцца - робіцца чалавекам, людзьмі. Ва ўсіх поспехах і дасягненнях універсітэта - важкі і бясспрэчны ўклад прафесарска-выкладчыцкага саставу і навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персанала, тэхнічных работнікаў. Вялікая роля заўсёды належала кіруючым кадрам - рэктару, прарэктарам, дэканам, загадчыкам аддзелаў і кафедр. З 1944 па 1998 гады калектыў узначальвалі рэктары М.В.Уласавец, І.М.Малюкевіч, Д.С.Маркоўскі, А.В.Бадакоў, Л.М.Ківач. З канца жніўня 1997 года на чале яго знаходзіцца доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар С.А.Маскевіч.

Я пісаў ужо на старонках "Гродзенскай праўды" пяць гадоў таму, у 1993, што па сведчанні дацэнта Г.А.Марціросава і былога галоўнага бухгалтара Ц.М.Гофмеклер, якія працавалі ў нашай вну адпа-

(Заканчэнне на 6-й стар.)

# УНІВЕРСІТЭТ І ЛЁСЫ

*(Пачатак на 3-5-й стар.)*

ведна са студзеня 1945 і 1948 гадоў, Мікалай Васільевіч Уласавец быў кіраўнік адукаваны і руплівы, гаспадарлівы і настойлівы. Пецярых апошніх я ведаў і ведаю асабіста: Іосіфа Мікалаевіча Малюкевіча як студэнт і па сумеснай працы на кафедры гісторыі СССР і БССР, Дзмітрыя Спірыдонавіча Маркоўскага і Аляксандра Васільевіча Бадакова - па сумеснаму кіраўніцтву нашай вну, пры іх я выбіраўся сакратаром партыйнага камітэта. У гады кіраўніцтва Л.М.Ківача і С.А.Маскевіча -па займаемай пасадзе дэкана факультэта гісторыі і культуры і загадчыка кафедры гісторыі Беларусі. На маю думку, Іосіф Мікалаевіч і Дзмітрый Спірыдонавіч былі людзьмі надзвычайнай сумленнасці, чалавечнасці і дабрыні. Падчас кіраўніцтва Д.С.Маркоўскага ўдалося ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу, пашырыць вучэбныя і жыллёвыя плошчы. Аляксандр Васільевіч Бадакоў аб'ектыўна заслугоўвае самай высокай ацэнкі. І не толькі таму, што ён больш за 20 гадоў з'яўляўся рэктарам, што пры ім пачалося станаўленне універсітэта, што ён меў шырокую эрудыцыю, увасабляў у сабе выдатныя якасці арганізатара, навукоўца і педагога, а за высокі прафесіяналізм у працы, уменне зазірнуць у заўтрашні дзень і апярэдзіць свой час, за душэўную спагадлівасць, уменне арганізаваць і павесці за сабой людзей. А гэта не кожнаму даецца, гэта ўжо ёсць дар Божы.

Леанід МікалаевічКівач працаваў рэктарам толькі тры гады, вельмі няпростых, але заявіў аб сабе як рэфарматар, многа паспеў зрабіць для тэхнічнага перааснашчэння універсітэта, набліжэння яго па форме і па зместу да класічнай універсітэцкай установы, вядучага вучэбнага, навуковага і культурнага цэнтра Гродзенскай вобласці, усяго заходняга рэгіёна Беларусі. Хаця аб дзеючым рэктары як бы не прыстала гаварыць тое, што думаеш, а толькі тое, што дазваляе этыкет, праўда жыцця дае мне права сказаць: Сяргей Аляксандравіч Маскевіч з'яўляецца першым рэктарам, які прызначаны на гэтую пасаду па просьбе калектыва універсітэта. І ў гэтым заключаецца самая высокая ацэнка яго чалавечых і прафесійных якасцей. Радуе, што зробленыя ім першыя крокі на гэтай высокай пасадзе - упэўненыя і цвёрдыя, скіраваныя на справу і чалавека, а асабістыя паводзіны -сціплыя, вызначаюцца даступнасцю і людскасцю. Яго ўзважанасць, спакой перадаюцца людзям. А гэта - добрая прыкмета. У ёй - залог поспехаў калектыва ў дні сённяшнім і заўтрашнім.



Значны след у развіцці ўстановы пакінулі прарэктары М.Я.Лявіцкі, М.В.Барсегян, Г.А.Марціросаў, Л.Д.Дрозд, А.Г.Высоцкая, М.І.Дудкін, А.А.Харытонаў, А.П.Сільвановіч, Б.М.Фіх, В.П.Казлоў, Л.У.Кірылюк, С.А.Габрусевіч, В.П.Таранцей, М.В.Васілючак, А.І.Васкабоеў, Я.А.Роўба, В.М.Горбузаў, шэраг дэканаў, загадчыкаў кафедр, выкладчыкаў. Дынамічна працуе і сённяшні склад кіруючых кадраў універсітэта. Прозвішчы многіх з іх ужо мною ўзгаданы вышэй. Лічу неабходным засяродзіць увагу чытачоў толькі на тых, хто прыехаў да нас за гады існавання універсітэта або дасягнуў зорных вышынь, працуючы ў яго сценах, хто патэнцыяльна ідзе на змену сённяшнім мэтрам. Сярод іх акадэмік НАН РБ А.І.Свірыдзёнак, дактары навук - прафесары С.В.Кандрацьева, А.І.Яроцкі, І.В.Гушчын, М.І.Канюшкевіч, Ч.С.Кірвель, М.І.Крамлёў, Д.У.Караў, І.Я.Лепешаў, А.М.Нечухрын, Г.А.Зорын, І.П.Мартынаў, С.Ф.Мусіенка, В.Я.Струк, А.П.Садоўскі, Ю.М.Рычкоў, А.А.Пякарскі, У.А.Баркоў, У.Д.Разенфельд, В.А.Ліопа, С.А.Мінюк, А.І.Васкабоеў, А.М.Карабанаў, М.У.Сільчанка, Т.Я.Аўтуховіч, А.У.Меляшэвіч, П.У.Сцяцко, С.С.Ануфрык, М.В.Жарскі, Л.У.Кірылюк, В.П.Таранцей, В.М.Чарапіца, Н.В.Паўловіч, С.А.Габрусевіч, В.Ц.Калмыкоў, В.А.Барыхін, Ю.М.Вувунікян, М.А.Маталыцкі, У.К.Пчэльнік, М.М.Спорнік, З.М.Наркун, С.А.Емельянава, С.Я.Кострыца, М.Г.Жданеня, Л.І.Смольская, А.А.Ляшчынскі, Г.Ф.Андрэйчык, З.П.Данільчык, Ю.Ю.Гняздоўскі, В.К.Царлюкевіч, П.Л.Навіцкі.

Вялікія надзеі ўскладаюцца на кандыдатаў навук - дацэнтаў А.А.Бародзіча, А.М.Баяркіна, Т.А.Бадзюкову, Ю.Р.Бейцюка, Л.У.Бярэйшык, Г.А.Гачко, М.М.Ганчарова, Г.У.Васюка, І.А.Змітровіча, І.В.Жука, К.У.Вербаву, А.Ю.Іванова, І.І.Коўкеля, В.А.Працэнка, Л.М.Сераду, Г.М.Семенчука, С.В.Марозаву, Т.М.Мікуліч, У.К.Краўцэвіча, Т.Т.Кручкоўскага, М.Я.Калацэй, В.М.Максімовіча, У.М.Карчэўскага, Т.К.Камарову, П.Р.Галузу, Т.І.Тамашэвіча, Л.В.Рычкову, Я.А.Роўбу, В.С.Істоміна, В.Ц.Леанаўца, В.Л.Малышаву, К.А.Мандрыка, Н.І.Уласюк, Ю.Э.Бялых, І.І.Вяленту, С.Я.Сяльверставу, І.А.Фёдарава, Э.С.Ярмусіка і іншых.

Многа працы, душы і сэрца ўкладваюць ва універсітэцкія справы старшыні прафкамаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў - У.А.Хілюта, студэнтаў - А.А.Грынь, галоўны бухгалтар Т.А.Герашчанка, загадчык канцылярыі В.Т.Сінчыліна, начальнік планава-эканамічнага аддзела Г.В.Барадаўка, гаспадарчага - А.І.Пачабут, аховы здароўя - Г.Я.Гайдашаў, кадраў - Б.Ф.Грыцэнка, ТСН - П.Ц.Рыбакоў, ІВЦ - М.К.Харук, выдавецкага - Я.С.Барталевіч, вучэбнага - Л.У.Бярэйшык, вучэбна-метадычнага - Т.А.Бадзюкова, выхаваўчага - Г.М.Кабяк, навуковага - Л.С.Гайда, падпарадкаваныя ім калектывы.

Хацеў бы напрыканцы сказаць, што з 1944 па 1998 гады ў педінстытуце і універсітэце падрыхтавана звыш 30 тыс. высокакваліфікаваных спецыялістаў. І па сённяшні дзень універсітэт падтрымлівае цесныя сувязі са сваімі выпускнікамі, а сярод іх былі і ёсць вядомыя ў Рэспубліцы Беларусь людзі - дзяржаўныя дзеячы, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, навучальных і навуковых устаноў, знакамітыя навукоўцы, пісьменнікі і спартсмены, буйныя кіраўнікі народнай гаспадаркі: першы намеснік Адміністрацыі Прэзідэнта РБ У.В.Русакевіч, сакратар ЦК ЛКСМБ Н.С.Нерад, сакратар Гродзенскага АК КПБ А.Я.Емельянава, намеснікі старшыні Гродзенскага аблвыканкама С.М.Андрыеўскі, М.М.Бірукова, М.Я.Калацэй, дырэктар інстытута гісторыі НАН Беларусі акадэмік М.П.Касцюк, начальнік аддзела Нацыянальнага сходу РБ прафесар У.М.Міхнюк, рэктар Беларускага дзяржаўнага педуніверсітэта імя М.Танка, прафесар Л.Н.Ціханаў, намеснікі старшыні Гродзенскага гарвыканкама А.У.Мілінкевіч, Я.М.Жабрун, пісьменнікі Фёдар Янкоўскі, Пятрусь Макаль, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава, алімпійскія чэмпіёнкі па гімнастыцы Алена Валчэцкая і Вольга Корбут, па штанзе - Аляксандр Курловіч, неаднаразовы чэмпіён Еўропы і прызёр свету па барацьбе Аляксандр Федарэнка, сярэбраны прызёр алімпіяды Пётр Пачынчук, чэмпіён універсіяды па плаванню Ірына Ларычава, футбаліст Сяргей Саладоўнікаў, былы сакратар Гродзенскага АК ЛКСМБ, старшыня Ашмянскага і Слонімскага райвыканкамаў, а цяпер дырэктар АТ "Белакт" у г.Ваўкавыску У.В.Лукашэвіч і іншыя.

# РАСЦЕ МАЛАДАЯ ЗМЕНА

## СУПЕРМОДЕЛЬ ИЗ ГрГУ



**Светлана Крук - студентка математического факультета. А еще она - самая красивая девушка Беларуси. Еще в прошлом году стала победительницей конкурса "Супермодель Беларуси". А еще через год доказала, что это была не случайность. Теперь она представит Беларусь на конкурсе "Мисс Вселенная".**

**Ну, а конкурс, который всё поставил на свои места, проходил так: выход в костюме Джульетты, деловом костюме, купальнике, мехах, кружевном белье и вечернем туалете. Наша Света была неотразимой...**

## БІЯЛОГІЯ — ГЭТА ПРЭСТЫЖНА



**Вольга Паўлюшчык, якую вы бачыце на гэтым здымку, не толькі прыгожая дзяўчына і надзейная сяброўка. Яна - чалавек, у якога ёсць мэта. Яна марыла стаць студэнткай ГрДУ - і стала. Цяпер Вольга ўжо на IV курсе факультэта біялогіі і экалогіі.**

**Фота Ул. САРОКІНА.**

*ДНИ НАУКИ - 98*

## КОНКУРС НАЗВАЛ ЛУЧШИХ

**О. СЕЧЕЙКО, А. СТАРОСТЕНКО,**
**студенты 4 курса факультета филологии**

С 6 по 11 апреля кафедра английского языка провела два конкурса среди студентов 4 курса на выявление лучших студенческих работ. Эти конкурсы заключались в написании философско-публицистического эссе на английском языке на тему "Человечество на пороге нового тысячалетия" и создании поэтического перевода сонета Дж.Донна, английского писателя 17 века.

В конкурсе на лучшее эссе участвовали практически все студенты 4 курса. Они продемонстрировали не только высокий уровень владения английским языком, но и глубокие размышления по поводу нашего будущего. Сколько тем было затронуто в работах!

Жюри, состоящее из преподавателей кафедры английского языка, выбрало 12 наиболее удачных эссе и 6 поэтических переводов. И вот здесь жюри встало в тупик: оказалось абсолютно невозможным выбрать только одну лучшую работу.

Как выход из создавшейся ситуации, жюри предложило 3 номинации: 1) лучшее эссе по форме и содержанию, 2) лучшее эссе по форме (стилю и грамотности); 3) лучшее эссе по содержанию (по глубине мысли). В первую номинацию вошли работы студентов О.Сечейко (62 гр.), Т.Сакович (62 гр.), Н.Деревлевой (62 гр.), Е.Анищенко (61 гр.), В.Селюна (61 гр.). Во вторую - эссе Д.Петроченко (62 гр.), Д.Шарко (62 гр.), И.Шевяковой (72 гр.), Д.Куля (61 гр.).

Путем голосования после прочтения были определены лучшие сонеты: самым поэтичным был признан перевод И.Шевяковой, а самым точным и близким к оригиналу - перевод Е.Голубинцевой.

Жюри решило ходатайствовать о поощрении равными денежными премиями всех номинантов конкурсов.

## С КВНом НАС ВСЕХ!

**Ю.СЕГИНЕВИЧ,**
**капитан университетской команды КВН**

1 апреля в актовом зале па ул. Ленина состоялось необычное для нашего университета мероприятие - финал конкурса КВН - 98. За право считаться самым остроумным, веселым и находчивым боролись команды факультета биологии и экологии "Титаник", филологического факультета "О-Ля-Ля" и физико-технического факультета "Творческий кризис". Эти команды еще в отборочных турах показали себя с хорошей стороны. Все-таки КВН для нашего города - это дело новое, неизвестное, и, хотя говорят, что первый блин комом, этот блин оказался на удивление удачным.

Постарались организаторы финала - профком студентов ГрГУ, отдел воспитательной работы и студенческий клуб. Ведь о призах и их количестве не знал до последнего момента практически никто. Очень порадовало оформление сцены - сколько же времени потратили художник и организаторы на украшение кулис, но все получилось! И это радует.

Победителем финала стала команда "Творческий кризис". С чем ее и поздравляем! Но поздравляли не только победителя, все команды получили призы и памятные медали. Генеральным спонсором выступил профком студентов, также подарки были от комитета по делам молодежи облисполкома, а команда-победитель получила еще и торт от отдела по работе с молодежью горисполкома. Поздравил всех финалистов и ректор ГрГУ С.А.Маскевич. Хочется надеяться на то, что КВН станет для нас привычным, и мы сможем наслаждаться им не только 1 апреля.

## ГрДУ - МАЯ МАРА

Наш карэспандэнт папрасіў студэнтаў розных факультэтаў ГрДУ адказаць на пытанні:

**- Што для вас значыць універсітэт?**

* * *

- О! Гэта мая даўняя мара, мая любоў, мая будучыня.

* * *

- Для мяне гэта магчымасць атрымаць прафесію.

* * *

- Прэстыжны дыплом, які я атрымаю, дапаможа мне ў жыцці.

* * *

- Веды - вось што галоўнае. Ну і, вядома, сябры...

* * *

- Універсітэт? Гэта аснова, гэта пачатак самастойнага жыцця.

* * *

- Ну, прэстыжна тут вучыцца...

* * *

- Тут такія людзі, такія цудоўныя выкладчыкі! А якая бібліятэка! Цэлае багацце...

* * *

- Не ведаю, што і казаць. Весела, дыскатэкі жывыя, сяброў шмат...

* * *

- Здаецца, што марную тут свой дарагі час. А жыццё праходзіць...

* * *

- Універсітэт - гэта назаўсёды, гэта нешта важкае, грунтоўнае...

**- Што не падабаецца, што хацелася б змяніць?**

* * *

- Хутчэй бы скончыўся рамонт, асабліва - у прыбіральнях.

* * *

- Хацелася б вучыцца заўсёды ў першую змену, у сваіх пастаянных аўдыторыях.

* * *

- Няхай больш будзе маладых выкладчыкаў. У іх светапогляд больш сучасны, і лекцыі адпавядаюць часу.

## ДА 54-Й ГАДАВІНЫ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

Пятро МАЛЯЎКА

# БЫЎ МЕСЯЦ ЖНІВЕНЬ...

Як толькі на ўсходзе пачало ружавець неба, а хата - незаўважна напаўняцца святлом, разганяючым начную цемрадзь, заганяючы падпечак таямнічыя цені - здані, якія зноўку дадуць аб сабе знаць на зыходзе дня, Агата расплюшчыла вочы.

Вось ужо больш як тры тыдні цяжкая хвароба не дае ёй падняцца. Сухі кашаль раз-пораз вырываецца з грудзей ужо даволі пажылой жанчыны. Баліць усё, асабліва ногі, як быццам іх прыгарнулі да яшчэ не затухшага вуголля, якое чамусьці не пячэ, а аддае колікамі ва ўсім целе. Кашаль ізноў раздзірае грудзі, і Агата нахіляецца ротам да падушкі, каб не пабудзіць дзяцей, якім так салодка спіцца пад раніцу. Іх у яе пяцёра. Дзве старэйшыя дачкі ўжо замужам; жывуць ндрэнна і зусім недалёка ад роднай вёскі. Амаль што ні кожны тыдзень праведваюць. Нешта накшалт усмешкі з'явілася на яе твары.

Але толькі на момант...

Крыўда на жыццё, якое рана, не на часе, забрала гаспадара, а самую прыкавала да ложка, ды яшчэ ў летнюю пару, запоўніла ўсю яе істоту.

- Што будзе з малодшымі, якія пры ёй, нямоглай? Хто ж іх падтрымае, калі з ёй штонебудзь здарыцца, здарыцца непапраўнае? Яны ж яшчэ не ўвабраліся ў сілу, асабліва самая меньшанькая, яе дачушка Настачка, прыгажунька, руплівіца, у якой усё ў руках гарыць?

Агата акінула позіркам ложкі, на якіх спалі дзеці. І толькі цяпер, магчыма, упершыню, зайважыла, як выраслі старэйшыя: Кастусь і Іванка. Яшчэ ўчора бегалі па дажджавых лужынах басяком, капашыліся на бульбяных барознах (як умелі, дапамагалі маці), а ўжо сёння - на іх трымаецца ўся гаспадарка: вельмі працавітыя. Пра гэта не раз яна чула ад людзей. І тады сэрца яе песцілася пяшчотай, замілаваннем, гонарам, што не абы-якімі вырастаюць, а дбайнымі, заахвочанымі да працы на зямлі.

Дзень зачынаўся. Сонечны прамень прывітаўся з акенцам і пераскочыў на тварык Настачкі, пачаў падарожнічаць па яе валасах, такіх густых і доўгіх, казытнуў за вуха, пацалаваў у вочкі.

У думках-успамінах Агата адчула, што як бы палягчэла, сціх кашаль. Яна адхінула коўдру і ўпершыню пад час хваробы ўстала сама. Накінула на плечы марнатку і ціха, хоць яшчэ кружылася галава, нетаропка выйшла на вуліцу.

Хата стаяла на поплаве, недалёка ад рэчкі, з якой цягнула прахалодай. Лес поўніўся птушынымі галасамі. Цёпла, палетняму павяваў вецер, нячутна падганяючы ў небе белыя хмаркі-баранчыкі.

Быў месяц жнівень, гарачая пара на вёсцы... Агата зазірнула на падворак суседа Мікалая. Там ужо ва ўсю кіпела жыццё: ладзілі калёсы, пакаваліся, каб у час выехаць на поле. Эх, лета! Ты і прыгожае, і клапатлівае. А сёння яшчэ - і трывожнае, і небяспечнае: твае дні распісала вайна.

Заўчора, калі сынам здалося, што маці спіць, яна выпадкова падслухала іх прыцішаную размову: ноччу па дарозе на Наваельню партызаны разграмілі варожую аўтакалону, шмат паклаўшы фашыстаў. Агату гэта моцна насцярожыла.

- А што, калі і яны там былі? Усяго якіх пяць кіламетраў да таго месца ад вёскі. Гэта ж... гэта пагражае ўсім ім... А яна ж да таго моцна хворая. Як быць?

Усхваляваная, глянула на раку, на вярхушку алешыны, і...раптам...маршчыністы твар яе змяніўся, затрэсла так, што аж стала холадна, ногі перасталі слухацца, сухі кашаль зноў здушыў грудзі.

...З боку лесу, як толькі магчыма было ахапіць вокам, не ішлі, а паўзлі ўзброеныя людзі з закасанымі рукавамі, штохвілінна набліжаючыся да вёскі. Жанчына як бы застыла, перахапіла дыханне. І толькі, калі да яе слыху данесліся выразныя каманды на нячутай ніколі мове, Агата зразумела ўсё: цяжка перастаўляючы ногі, давячыся кашлем, увайшла ў хату і з крыкам: "Дзетачкі! Немцы!" - упала на ложак.

Прачнуліся ўсе: сон як рукой зняло. Перапалоханыя твары.

На падворку загрукалі боты, з шумам расчыніліся дзверы, і ў хату ўвалілася шасцёра ў карычнявых мундзірах і адзін у цывільным з белай павязкай на рукаве.

- Ты і ты, - ткнуў аўтаматам у Кастуся і Іванку высокі хударлявы немец, - говориль, где портизаны?

- Мама! Ма-мач-ка! Што з намі будзе? - заплакала Настачка, ды так голасна, што неяк стала не па сабе Агаце, так балюча, як бы хто кроіў уласнае сэрца на часткі тупым нажом. Гэты плач крыху ацверазіў яе. Не разумеючы, адкуль узяліся сілы, яна адарвалася ад падушкі, моўчкі глянула на дзяцей. Іх вочы стрэліся!

Што яна магла ім сказаць? Чым дапамагчы? А яны прасілі дапамогі, прагнулі выратавальнага слова ад самага блізкага і дарагога чалавека, надзейнага заступніка, самага справядлівага суддзі ў іх жыцці.

- А ты, жаба малая, - у цывільным вельмі груба штурхануў Настачку ў плячук, - таксама не ведаеш? Ну-ну? - і тут жа скамандаваў:

- Шнэль. Выходзь.

Агата памкнулася сказаць, замахала рукамі, ды сілы яе ўжо пакідалі. Настачка рванулася да маці, але жалезны выкрык: "Назад!" - спыніў яе.

...Бразнулі дзверы, так, што шыбы забарабанілі ў вокнах, і наступіла незразумелая цішыня. Маці ляжала на ложку, уставіўшыся вачамі ў покуць, дзе вісела святая ікона.

Ледзь рухомымі вуснамі, склаўшы на грудзях рукі, яна шаптала малітву: сваю апошнюю просьбу, апошні зварот да Бога, каб вярнуць дзяцей.

Быў жнівень...Ішоў трэці месяц вайны...

## ГрДУ - МАЯ МАРА

(Пачатак на 7-й стар.)

- Я дабавіла б стыпендыю тым, хто пасляхова вучыцца.

* * *

- Больш вечарын, дыскатэк, КВЗ!

* * *

- Каб мы атрымлівалі веды не толькі па пэўнай дысцыпліне, але і вывучалі жыццё, прыстасоўваліся да яго ўжо ў аўдыторыях.

* * *

- Мне ўсё падабаецца. Вось толькі каб экзаменаў ды залікаў было менш...

* * *

- Каб гэта было ў маіх сілах, адправіў бы на адпачынак усіх пенсіянераў. Акрамя акадэміка Яроцкага.

**Калі б можна было пачаць усё зноў, ці прыйшлі б Вы сюды?**

* * *

- Толькі сюды, толькі ў ГрДУ. Тут я адчуў сябе асобай.

* * *

- Я тут сустрэла свой лёс, у мяне ўжо ёсць дачушка. А сёлета і дыплом атрымаю. Адчуваю сябе шчаслівай ад таго, што я заканчваю менавіта ГрДУ.

* * *

- Пайшоў бы лепш у сантэхнікі...

* * *

- Прэстыжны універсітэт, я не шкадую, што сюды паступіў.

* * *

- Трэба было ў сталіцу падацца. Правінцыя ёсць правінцыя.

* * *

- Толькі ў ГрДУ, і толькі на свой філфак!

**На пытанні адказвалі студэнты філалагічнага, юрыдычнага і фізіка-тэхнічнага факультэтаў.**

Рэдактар Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА

Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Ліц. ЛП №111 ад 29.12.97 г. 230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22.

Набор і Вёрстка: М. ВЕРСТАК, П. БАЗЫЛЬЧЫК

Карэктура: Н.ДУДКО

Здадзена ў набор 18.05.98

Падпісана да друку: 22.05.98, 15.00

Заказ № 68

Аб'ём - 1 ум. друк. арк. Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас: 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, п.228. ☎ 72-08-17.